Установа адукацыі
“Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў”

Прарэктар па вучэбна
З С..
Прарэктар па вучэбнай рабоце БДУКМ
_______________ С.Л.Шпарло
“24” __10__ 2022 г.
Рэгістрацыйны № ВД 457 /эвуч.

# МЕТОДЫКА ВЫКЛАДАННЯ СПЕЦДЫСЦЫПЛІН

Вучэбная праграма ўстановы вышэйшай адукацыі
па вучэбнай дысцыпліне для спецыяльнасці
*1-18 01 01 Народная творчасць (па напрамках),*
*напрамку спецыяльнасці*
*1-18 01 01-01 Народная творчасць (харавая музыка),*
*спецыялізацыі 1-18 01 01-01 02 Харавая музыка народная;*
*спецыяльнасці 1-16 01 10 Спевы (па напрамках)*
*напрамку спецыяльнасці 1-16 01 10-02 Спевы (народныя)*

2022

Вучэбная праграма складзена на аснове адукацыйных стандартаў вышэйшай адукацыі I ступені па спецыяьнасцях 1-18 01 01 Народная творчасць (па напрамках), 1-16 01 10 Спевы (па напрамках) зацверджаных пастановай Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь ад 12 красавіка 2022 г. № 78, вучэбных планаў БДУКМ па напрамках спецыяльнасці


**Складальнікі:**

*Л.І. Холупава,* прафесар кафедры народна-песеннай творчасці і фальклору, установы адукацыі "Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў", дацэнт;

*Л.В. Снапкова,* дацент кафедры народна-песеннай творчасці і фальклору ўстановы адукацыі "Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў";

*П.А. Базылева*, выкладчык кафедры народна-песеннай творчасці і фальклору ўстановы адукацыі "Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў"



**Рэцэнзенты:**

*Н.І.Ламановіч,* галоўны хормайстар дзяржаўнай тэатральна-відовішчнай установы "Нацыянальны акадэмічны Вялікі тэатр оперы і балета Рэспублікі Беларусь" народная артыстка Рэспублікі Беларусь;

*Т.С.Гажевская –Пешак,* дацэнт кафедры харавой музыкі, кандыдат педагагічных навук, дацэнт.



*кафедрай* народна-песеннай творчасці і фальклору ўстановы адукацыі "Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў" (пратакол №10 ад 24. 05.2022);

*прэзідыумам* навукова-метадычнага савета ўстановы адукацыі "Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў" (пратакол №5 ад 15.06.2022).

# ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Вучэбная дысцыпліна "Методыка выкладання спецдысцыплін" ставіць сваёй задачай комплекснае развіццё і выхаванне асобы.

Вучэбная дысцыпліна "Методыка выкладання спецдысцыплін" звязана з такімі вучэбнымі дысцыплінамі як: "Харавы клас", "Пастаноўка голасу", "Дырыжыраванне", "Методыка работы з хорам", "Педагогіка" і г.д.

Засваенне вучэбнай дысцыпліны "Методыка выкладання спецдысцыплін" павінна забяспечыць фарміраванне базавых кампетэнцый:

– Выкладаць спецдысцыпліны на высокім навукова-тэарытычным узроўні, прымяняць метады і сучасныя методыкі навучання народным спевам;

– Прымяняць веды ў галіне тэорыі і методыкі педагагічнай дзейнасці, разумець інавацыйныя працэсы ў адукацыі

*Мэта* вучэбнай дысцыпліны – падрыхтоўка высокапрафесійнага музыканта-педагога, які валодае тэарэтычнымі і практычнымі ведамі і навыкамі. Галоўнае – умець апірацца на іх у працы, выхоўваць вакальна-харавое майстэрства і аказваць непасрэднае ўздзеянне на фарміраванне мастацкага густу, ідэйных і творчых поглядаў студэнтаў.

Асноўныя *задачы* вучэбнай дысцыпліны:

– фарміраванне прафесійнай накіраванасці, актыўных і зацікаўленых адносін да будучай прафесіі;

– авалодванне навыкамі тэхнікі дырыжыравання і вакальнага майстэрства,
комплексам сродкаў кіравання харавым і вакальным калектывамі;

– развіццё педагагічных і арганізацыйных здольнасцей;

– развіццё навыкаў самастойнай і рэпетыцыйнай работы;

– развіццё агульнамузычных і выканальніцкіх здольнасцей;

– уменне рэалізаваць у рабоце тэарэтычныя веды, выканальніцкія навыкі, якія студэнт атрымаў у працэсе вывучэння прадметаў спеццыкла.

У выніку вывучэння вучэбнай дысцыпліны "Методыка выкладання спецдысцыплін" студэнт павінен *ведаць:*

– спецыфічныя асаблівасці выкладання дысцыпліны ў розных тыпах навучальных устаноў;

– методыку правядзення індывідуальных заняткаў;

– асаблівасці методыкі працы над музычным творам на розных этапах.

– тэарэтычныя асновы дырыжорскага і вакальнага выканальніцтва;

– сістэму сродкаў дырыжорскай і вакальнай выразнасці;

– спецыфіку падрыхтоўкі вучня да канцэртнага выступлення, да выканаўчага конкурсу;

– сучасную метадычную літаратуру па дырыжыраванні і вакальным мастацтве;

*умець:*

– планаваць навучальны працэс з улікам узросту і ўзроўню падрыхтоўкі навучэнцаў, паслядоўна развіваць іх музычныя здольнасці, прафесійныя ўменні і навыкі;

– праводзіць урокі розных форм і тыпаў;

– вырашаць пэўныя мастацкія і тэхнічныя задачы;

– выкладаць дырыжыраванне, пастаноўку голасу ва ўстановах музычнай адукацыі, выкарыстоўваючы класічныя і сучасныя методыкі;

– працаваць з вучэбна-метадычнай літаратурай.

*валодаць:*

– метады, формы і змест эстэтычнага выхавання і адукацыі дзяцей рознага ўзросту;

– тэхналогіі эстэтычнага выхавання і адукацыі дзяцей у розных установах сацыякультурнай сферы;

–тэорыю і методыку выкладання спецдысцыплін;

У адпаведнасці з вучэбным планам на вывучэнне вучэбнай дысцыпліны “Методыка выкладання спецдысцыплін” усяго адведзена 90 гадзін, з якіх 34 гадзіны – аўдыторныя (22. – лекцыі, 12 – семінарскія) заняткі.

Рэкамендаваная форма кантролю ведаў студэнтаў – экзамен.

## ЗМЕСТ ВУЧЭБНАГА МАТЭРЫЯЛА

### *Уводзіны*

Асаблівасці прафесіі дырыжора і яе поліфункцыянальнасць. Сутнасць і тэарэтычныя асновы дырыжорскага выканаўства; чатыры асноўныя стадыі працэсу гукавога ўвасаблення музычнага твора Паняцце "дырыжорскі жэст" як асноўны сродак інфармаравання.

### Раздзел I. Дырыжыраванне

#### *Тэма 1. Правілы і прынцыпы пастаноўкі дырыжорскага апарату*

Арганізацыя і пастаноўка дырыжорскага апарату як паслядоўнае асваенне комплексу тэхнічных прыёмаў і іх тыпавых відаў. Узаемазвязаныя элементы, якія складаюць дырыжорскі апарат. Непрыгоднасць вузкіх правілаў для пастаноўкі дырыжорскага апарату. Прынцыпы пастаноўкі дырыжорскага апарату: свабод рухаў; графічнай яснасці рухаў; эканоміі рухаў; папярэджвання; гукарухаў; меласу; мастацкай мэтанакіраванасці. Комплекс практыкаванняў для арганізацыі дырыжорскага апарату:

- практыкаванні, якія садзейнічаюць пастаноўцы асноўных пазіцый рук, корпуса, галавы;
- практыкаванні, якія садзейнічаюць разняволенні дырыжорскага апарату;
- практыкаванні на адчуванне апоры на дырыжорскай плоскасці пры поўнай свабодзе рукі, правільнай форме кісці і г.д.

Фарміраванне навыкаў пастаноўкі дырыжорскага апарату з магчымасцю прыцягваць увагу да сваіх адчуванняў па каардынацыі жэста і гуку. Выработка мышачнага кантралёра.

#### *Тэма 2. Структура і значэнне аўфтакта, віды аўфтактаў*

Аўфтакт – носьбіт апераджальнай функцыі ў працэсе падрыхтоўкі выканання музыкі. *Структура* аўфтакта як аналаг арганізацыі дыхальнага працэсу (элементы рухаў). *Функцыі* аўфтакта ў вызначэнні пачатковага моманту выканання, тэмпу, дынамікі і г.д. Адрозненні аўфтактаў па хуткасці, амплітудзе даўжыні, моцы, масе, накіраванасці і форме. *Напоўненасць* аўфтакта. *Віды* аўфтактаў: поўны (двухфазны), няпоўны (аднафазны), затрыманы, паміждольны, кантрасны, камбінаваны і г.д. Аўфтакт, як актыўны інструмент псіхалагічнага ўздзеяння дырыжора. Тры асноўныя становішчы "маўленчага жэста".

#### *Тэма 3. Прынцыпы работы над засваеннем дырыжорскіх схем*

Паслядоўнасць вывучэння дырыжорскіх схем ( 3/4; 4/4; 2/4):

- разбор структуры тактавага цыкла;
- структура жэста – кропкі і запаўняючыя іх рухі;
- правілы выканання дырыжорскіх сетак;
- адпрацоўка схемы на спецыяльных практыкаваннях без музыкі.

Біфункцыянальнасць дырыжорскага жэста. Асэнсаванне "кропкі" як асноўнага моманту фіксацыі долей такта. Класіфікацыя кропак. Галоўны прынцып пры вывучэнні дырыжорскіх сетак: графічная дакладнасць

(яснасць) рухаў; суадносіны моцных і слабых долей такта пры вядучай ролі моцнай долі; актыўныя, пасіўныя рухі. Дырыжорскія сеткі на 2, 3, 4, структурная аснова для ўсіх памераў. Спецыфіка дырыжыравання складаных і несіметрычных памераў .Залежнасць выбару поўнай ці скарочанай схемы ад характару, тэмпу, выканальніцкіх задач. Трохмернасць дырыжорскага малюнка .

### *Тэма 4. Функцыі тактавання і дырыжыравання*

Тактаванне (метранаміраванне) – аснова сучаснай дырыжорскай тэхнікі. Галоўныя задачы дырыжыравання – авалоданне дырыжорскімі прыёмамі і адбор жэстаў для ўвасаблення музычнага вобраза.

Асноўныя віды дырыжорскага мастацтва ў яго гістарычным развіцці:

- кіраванне рытмічным бокам выканання пры дапамозе стуку (рукой, нагой, палкай і інш.);
- хейраномія – мнеманічны спосаб пазначэння адноснай вышыні гуку і яго працягласці, меладычнага контуру пры дапамозе рухаў рук, пальцаў, галавы, цела;
- кіраванне выкананнем пры дапамозе ігры на інструменце (ці спевы ў хоры).

*Дапаможная* (ніжэйшага парадку) *тэхніка* як сукупнасць прыёмаў паказу ўступаў, зняцця гуку, паказу фермат, пауз, пустых тактаў і тактавання (пазначэнне памеру, метра, тэмпу). *Выразная* (вышэйшага парадку) *тэхніка* – гэта прыёмы, з дапамогай якіх вызначаюцца змена тэмпу, дынамікі, акцэнтоўкі, артыкуляцыі, фразіроўкі, штрыхі стаката і легата; прыёмы, якія даюць уяўленне пра інтэнсіўнасць і афарбаванасць гуку. *Вобразна-выразныя* прыёмы як сукупнасць дапаможнай і выразнай тэхнікі. Сродкі эмацыянальнага парадку і валявога ўздзеяння на выканаўцаў Задача дырыжора – адлюстроўванне розных эмоцый розных вобразаў, а не свой стан. Дырыжорскае мастацтва як гарманічные суадносіны абодвух бакоў – тэхнічнай і мастацка-выразнай.

### *Тэма 5. Прыёмы авалодання дырыжорскімі сродкамі выразнасці (дынаміка, тэмп, фразіроўка, і г.д. )*

Прырода выразнасці жэста, яго класіфікацыя. Узаемасувязь і ўзаемаабумоўленасць музыкі і жэста. Жэст як працяг эмацыянальнага стану чалавека. Рукі як найбольш актыўная і чулая частка вобразна – зрокавага механізма. Неабходнасць прасторавага ўяўлення для вобразнай выразнасці дырыжорскіх жэстаў. Сродкі дырыжорскай выразнасці: дынаміка і жэст; тэмп і жэст; фразіроўка і жэст; тэмбр і жэст(увага да змены амплітуды, тыпу рухаў, хуткасці, актыўнасці першай долі, напоўненасці кісці і г.д.). Экспрэсіўная функцыя дырыжора.

### *Тэма 6. Метады арганізацыі самастойнай работы студэнтаў па развіцці прафесійных навыкаў*

Структура прафесійных навыкаў (залежнасць ад характара дзейнасці дырыжора – аналітычнай, выканальніцкай, практычнай, метадычнай). Змест самастойных заняткаў: асваенне партытуры; развіццё навыкаў

дырыжыравання. Работа над партытурай: дасканалы аналіз партытуры; асваенне партытуры за фартэпіяна; асваенне партытуры пры дапамозе ўнутранага слыху; мануальнае засваенне партытуры. Асноўныя прынцыпы самастойнай работы. Метады раздзельнага засваення. Метад параўнання. Пошукі дырыжорскіх сродкаў для перадачы ў жэстах: дынамікі, фразіроўкі, развіцця формы, вобразна-эмацыянальнага характару музыкі і г.д. Дыханне як крытэрый дакладнасці дырыжорскага жэста падчас хатніх заняткаў. Аснова самастойнай работы – развіццё слыхавой увагі, рухальных уменняў і навыкаў, пошук і адбор выразных жэстаў, развіццё дырыжорскага мыслення. Недахопы, якія сустракаюцца пры рабоце вучняў над партытурай. Фарміраванне перадрэпетыцыйнай тэхнікі.

### *Тэма 7. Прыёмы работы над раздзяленнем функцый рук дырыжора. Унутрыдолевая пульсацыя*

Рукі – вядучая частка дырыжорскага апарату, галоўны сродак зносін з хорам. Выразныя функцыі рук. Раздзяленне функцый правай і левай рукі. Асноўныя патрабаванні да правай і левай рук. Асноўнае адрозненне функцій левай і правай рукі. Рухальныя тыпы рук: сіметрычныя, паасобныя. Практыкаванні над незалежнасцю рук:

- вертыкальныя рухі рукі (уверх, уніз), калі тактуе правая;
- уступы і здыманні левай рукой, калі тактуе правая;
- гарызантальныя рухі левай рукі, (прывядзенне і адвядзенне), калі тактуе правая;
- кругавыя рухі левай рукі, калі тактуе правая;
- тактаванне ў розных метрах: левая рука - у трохдольным, правая - у чатырохдольным і іншыя.

Свабодная каардынацыя, незалежнасць рук –.адна з самых складаных праблем тэхнікі дырыжыравання. Метрычныя схемы, вывучэнне іх кожнай рукой паасобку. Асаблівасці выхавання рытмічнай пульсацыі – УДП, ЛДП.

### *Тэма 8. Метады развіцця вакальна-харавога слыху, слыхавой увагі ў працэсе выхавання дырыжора*

Выхаванне вакальна-харавога слыху і слыхавой увагі – адна з галоўных задач дысцыпліны. Дзве функцыі слыху. Аб'яднанне эмацыянальнай і слыхавой сфер, якія каардынуюцца з рухальнай – задача, якая патрабуе рашэння. Накіраванасць выканаўчай (дырыжорскай) волі. Закон “дамінанты”. Слых як цэласная сістэма, якая развіваецца. Спецыфіка выхавання слыху ў працэсе вывучэння і ўвасаблення музычных твораў. Слых – актыўны працэс, які ўключае ў сябе аналіз, сінтэз, суадносіны, супастаўленне, абагульненне і г.д. Сістэматычнасць і паслядоўнасць у развіцці слыху. Метады, якія вядуць да яго актывізацыі і інтэнсіўнага развіцця. Выхаванне слыху ў двух напрамках: вузканакіраванае і шыроканакіраванае. Чуццё – рэтраспектыўнае, перспектыўнае. Выхаванне “слыхавойй рукі” , “думаючага слыху”.

Прыёмы развіцця слыху. Тры накіраванасці ў развіцці слыхавой увагі: "карэктарская", "выканальніцкая", "педагагічная". Вядучы прынцып па развіцці слыху ад унутранага да знешняга.

### *Тэма 9. Развіццё навыкаў рэпетыцыйнай работы ў дырыжорскім класе*

Рэпетыцыйная работа – як здольнасць у кароткі тэрмін і з найменшымі затратамі дасягнуць у рабоце з выканаўцамі найлепшых вынікаў. Тры фактары ўзаемадзеяння дырыжора з выканаўцамі. "Інструментарый дырыжора".

Асэнсаванне метадалогіі рэпетыцыйнага працэсу. Сістэматычнасць развіцця навыку рэпеціравання на занятках дырыжыравання. Метад аналогій. Развіццё здольнасці *канцэнтраваць* і накіроўваць слыхавую ўвагу на розныя бакі выканальніцтва. Выкарыстанне прыёму "часовага мадэлявання недакладнасцей". Выхоўванне навыку *кантралявання* з устаноўкай на заўвагі тых ці іншых недакладнасцей выканання, хутка выяўляць іх прычыны і знаходзіць неабходныя сродкі для выпраўлення. Развіццё навыку ўмення дакладна, лаканічна фармуляваць свае заўвагі, пры гэтым кантраляваць манеру трымацца перад калектывам. Развіццё эмацыянальна.–.валявых якасцей. Выпрацоўка рэпетыцыйнай тэхнікі. Развіццё навыку асэнсавання метадычных установак педагога.

### *Тэма 10. Некаторыя пытанні работы над творамі буйной формы ў класе харавога дырыжыравання*

Спецыфіка вывучэння твораў буйной формы як неабходнасць разумення цэласнасці формы , драматургіі, заканамернасці развіцця музычных вобразаў і г.д. Падрыхтоўчая работа ўмоўна падзялецца на тры этапы:

- агульнае ўяўленне аб музыцы, аб асноўных мастацкіх вобразах;
- паступовае паглыбленне ў сутнасць твора;
- трактоўка.–.інтэрпрэтацыя і тэхнічнае ўвасабленне.

Пытанні выканальніцкага аналізу:

- якую думку (змест) перадаюць аўтары (аналіз паэтычнага тэксту, гісторыя стварэння твора, канкрэтная гістарычная абстаноўка дзеяння (калі вывучаецца оперная сцэна) , ці літаратурная першакрыніца (кантата, араторыя і г.д.);
- якімі музычнымі сродкамі перадаецца змест;
- якімі дырыжорскімі сродкамі і прыёмамі рэалізуецца вобраз;
- якія вакальныя, інтанацыйныя, рытмічныя, ансамблевыя і іншыя тэхнічныя складанасці ўзнікаюць у працэсе выканання.

Разуменне спецыфічнай асаблівасці опернага дырыжыравання. Вызначэнне сцэнічнага дзеяння як адзінага псіхафізічнага працэсу, дзвіжучай сілай якога з'яўляецца канфлікт. Асаблівасці падыходу ў дырыжыраванні харавых сцэн, ансамбляў, фугі, канона, рэчытатыву.

## Раздзел II. Пастаноўка голасу і сольных спеваў

### *Тэма 11. Агульнадыдактычныя і спецыяльныя музычныя прынцыпы вакальнага навучання*

Агульнадыдактычныя і спецыяльныя музычныя прынцыпы навучання:

- прынцып выхаваўчага навучання;
- прынцып навуковасці;
- прынцып свядомасці;
- прынцып сувязі з жыццем (практыка) і інш.

Асноўны прынцып вакальнай педагогікі – прынцып адзінства мастацкага і тэхнічнага бакоў навучання. Прынцып паступовасці і паслядоўнасці.

Індывідуальны падыход пры індывідуальным вакальным навучанні.

Фарміраванне тэхнічных навыкаў у адзінстве з эмацыянальным падтэкстам і мастацкай выразнасцю. Тлумачальна-ілюстратыўны і рэпрадуктыўны метады навучання.

### *Тэма 12. Звесткі аб галасавым апараце*

Галасавы апарат. У яго склад уваходзяць: поласці рота і носа з прыдатачнымі поласцямі, глотка, гартань з галасавымі звязкамі, трахея, бронхі, лёгкія, грудная клетка з дыхальнымі мышцамі і дыяфрагмай, мышцы брушной поласці. Органам, дзе ўзнікае пеўчы голас, з'яўляецца гартань. Галасавыя звязкі (сапраўдныя і несапраўдныя). Дыяфрагма – аснова груднной клеткі. Органы надстаўной трубы. Міндаліны. Іх абарончая функцыя.

### *Тэма 13. Пеўчае дыханне і апора*

Дыханне як энергетычны фактар, ад якога залежыць сіла і даўжыня гуку, яго тэмбравыя фарбы.

Тыпы дыхання (ключычнае, груднное, змешанае, дыяфрагмальнае або брушное). Удых і выдых – прафесійнае майстэрства валодання пеўчым дыханнем.

Позех– метадычны прыём адвольнага апускання гартані.

Апора дыхання – уменне падтрымліваць неабходны для галасаўтварэння падскладачны ціск выдыхаемага паветра. Асноўныя крытэрыі пеўчай апоры. Адчуванне дзвюх кропак у час спеваў на апоры.

### *Тэма 14. Працэс галасаўтварэння*

Пеўчы гук як акустычная з'ява. Асноўныя ўласцівасці гуку: вышыня, сіла, тэмбр, працяжнасць. Асаблівая якасць пеўчага гуку вібрата.

Атака гуку. Розныя варыянты ўзаемаадносін галасавых звязак і дыхання: цвёрдая, мяккая, прыдыхальная атакі гуку.

Узаемадзеянне галасавых звязак і дыхання. Распаўсюджванне гуку па паветраносных поласцях і тканках, акустычныя яго змены.

Верхнія і ніжнія рэзанатары. Галаўное і грудное рэзаніраванне, паўпрыкрытая манера спеваў.

### *Тэма 15. Прыёмы і метады ўдасканальвання галасавога апарату*

*Вакальныя практыкаванні* – удасканальванне вакальных навыкаў:

- паўторнасць;
- спецыяльна арганізаваныя дзеянні;
- мэтанакіраванасць.

Мэты фарміравання і развіцця навыкаў. *Пеўчая дыкцыя.* Артыкуляцыйны апарат, яго размоўная ўстаноўка. Адрозненне моўнай дыкцыі ад пеўчай. Вакальныя і музычныя патрабаванні да дыкцыі. *Галосныя ў спевах.* Галоўны артыкуляцыйны орган. Выхаванне пеўчага голасу, фарміраванне вакальных галосных. Фарміраванне галоснага гуку. Якасць гуку – правільная работа артыкуляцыйных органаў. Фанетычны метад вакальнага навучання. Рэдуцыраванне галосных у працэсе спеваў. Практыкаванні па вымаўленні галосных гукаў. *Зычныя гукі ў спевах.* Звонкія і глухія. Санорныя зычныя – самыя зручныя для спеваў. Выразнае вымаўленне зычных вядзе да ярчэйшага гучання голасу.

### *Тэма 16. Метадалагічныя асновы фарміравання вакальнай тэхнікі і музычнай выразнасці*

Індывідуальны падбор твораў у суадносінах з вакальнымі, музычнымі і эмацыянальнымі здольнасцямі, з улікам перспектывы развіцця. Метадалагічная аснова падбору вакальнага твора. Прынцыпы пачатковага навучання сольным спевам. Вакальная культура спевака.

### *Тэма 17. Гігіена, рэжым і хваробы голасу*

Норма спеўнай нагрузкі і ўзровень вакальнага майстэрства. Прастудныя захворванні (танзіліт, фарынгіт, ларынгіт, трахеіт, бранхіт). Прафесійныя захворванні (спеўныя вузлы, незмыканне галасавых звязак).

## ВУЧЭБНА-МЕТАДЫЧНАЯ КАРТА

| Раздзелы і тэмы | Колькасць аўдыторных гадзін | | | КСР | Форма кантролю ведаў |
|---|---|---|---|---|---|
| | усяго | лекцыі | семінарскія | | |
| ***Уводзіны*** | 1 | 1 | | | |
| **Раздзел I. Дырыжыраванне** | | | | | |
| *Тэма 1.* Правілы і прынцыпы пастаноўкі дырыжорскага апарату | 1 | 1 | | | |
| *Тэма 2.* Структура і значэнне аўфтакта , віды аўфтактаў | 4 | 1 | 1 | 2 | Пісьмовае заданне |
| *Тэма 3.* Прынцыпы работы над засваеннем дырыжорскіх схем | 1 | 1 | | | |
| *Тэма 4.* Функцыі тактавання і дырыжыравання | 1 | 1 | | | |
| *Тэма 5.* Прыёмы авалодання дырыжорскімі сродкамі выразнасці (дынаміка, тэмп, фразіроўка і г. д.) | 4 | 1 | 1 | 2 | Пісьмовае заданне |
| *Тэма 6.* Метады арганізацыі самастойнай работы студэнтаў па развіцці прафесійных навыкаў | 1 | 1 | | | |
| *Тэма 7.* Прыёмы работы над раздзяленнем функцый рук дырыжора. Унутрыдолевая пульсацыя | 1 | | 1 | | |
| *Тэма 8.* Метады развіцця вакальна-харавога слыху, слыхавой увагі ў працэсе выхавання дырыжора | 1 | 1 | | | |
| *Тэма 9.* Развіццё навыкаў рэпетыцыйнай работы ў дырыжорскім класе | 1 | 1 | | | |
| *Тэма 10.* Некаторыя пытанні работы над творамі буйной формы ў класе харавога дырыжыравання | 1 | 1 | | | |
| **Раздзел II. Пастаноўка голасу і сольных спеваў** | | | | | |
| *Тэма 11.* Агульнадыдактычныя і спецыяльныя музычныя прынцыпы вакальнага навучання | 1 | 1 | | | |
| *Тэма 12.* Звесткі аб галасавым апараце | 1 | 1 | | | |
| *Тэма 13.* Пеўчае дыханне і апора | 5 | 2 | 1 | 2 | Тэст |
| *Тэма 14.* Працэс голасаўтварэння | 2 | 2 | | | |
| *Тэма 15.* Прыёмы і метады ўдасканальвання галасавога апарату | 6 | 2 | 2 | 2 | Тэст |
| *Тэма 16.* Метадалагічныя асновы | 1 | 1 | | | |

| | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| фарміравання вакальнай тэхнікі і музычнай выразнасці | | | | | |
| *Тэма 17.* Гігіена, рэжым і хваробы голасу | 1 | 1 | | | |
| **Усяго** | **34** | **20** | **6** | **8** | |

## ІНФАРМАЦЫЙНА-МЕТАДЫЧНАЯ ЧАСТКА

### Літаратура

Асноўная

1. Дмитриев, Л.Б. Основы вокальной методики / Л.Б. Дмитриев. – Москва : Издательство «Музыка», 2012. – 366 с.

2. Живов, Владимир Леонидович. Хоровое исполнительство: теория, методика, практика : учебное пособие для студентов вузов / В. Л. Живов. – Москва : ВЛАДОС, 2003. – 270 с. – (Учебное пособие для вузов).

3. Казачков, Семен Абрамович. Дирижерский аппарат и его постановка : учебное пособие для музыкальных вузов / С. Казачков. – Москва : Музыка, 1967. – 109, [2] с., [8] л. ил. : рис. ; 26x17 см. – Библиогр. в подстроч. примеч. – 23.00

4. Калугина. Н.В. Методика работы с русским народным хором : учебник для муз. вузов /Н.В. Калугина. – Москва : Издательство «Музыка», 1977. – 255 с.

5. Мешко, Н.К. Искусство народного пения: практ. рук-во и методика обучению искусству народного пения: учеб. пособие для педагогов и студентов сред. и высш. учеб. заведений, руководителей и артистов народных хоров и ансамблей / Н.К. Мешко. – Архангельск : Издательство «Правда Севера», 2007. – 126 с.

6. Мусин, И. А. О воспитании дирижера: Очерки / И. А. Мусин. – Ленинград : Издательство «Музыка», 1987. – 246 с.

7. Холупова Л.И. Методика преподавания спецдисциплин: курс лекций / Л.И. Холупова. – Минск : Белорус. гос. ун-т культуры и искусств, 2011. – 140 с.

8. Шамина, Л.В. Основы народно-певческой педагогики: учебное пособие / Л.В. Шамина. – 3-е изд., стер. – Санкт-Петербург : Издательство «Планета музыки», 2017. – 200 с.

Дадатковая

1. Акулов, Е. А. Оперная музыка и сценическое действие / Е.А. Акулов. – М.: ВТО, Москва, 1978. – 453 с.

2. Асафьев, Б.В. О хоровом искусстве / Б.В. Асафьев. – Л.: Музыка, 1980. – 216 с.

3. Баренбойм, Л.А. Музыкальная педагогика и исполнительство / Л.А. Баренбойм. – Л.: Музыка, Ленинград. отд., 1974 . –335 с

4. Баренбойм, Л.А .Путь к музицированию /Л.А. Баренбойм. – Л.: Сов. композитор, 1979. – 350 с.

5. Дмитриев, Л.Б. Вопросы вокальной педагогики / Л.Б. Дмитриев. – Вып. 5 – М.: «Музыка», 1976. – 261 с.

6. Яковлева, А.Н. Вопросы вокальной педагогики / А.Н. Яковлева. – Вып. 7. – М.: Музыка, 1984. – 214 с.

*Ержемский, Г.Л.* Дирижеру XXI века. Психолингвистика профессии. / Г.Л. Ержемский. – СПб.:Издат. ДЕАН, 2007. – 240 с.

7. Ержемский, Г.Л. Закономерности и парадоксы дирижирования: Психология. Теория. Практика / Г.Л. Ержемский. – С – б.: ПКП "Деан", 1993. – 261 с.

8. Левандо, П.П. Хоровая фактура: монография / П.П. Левандо. – Л.: Музыка, 1984. – 51 – 68 С.

9. Романовский, Н.В. Хоровой словарь / Н. Б. Романовский – М.: Музыка, 2000. – 228 с.

10. Шиманович, Л.А. Практические формы работы в классе хорового дирижирования / Л. А.Шиманович. – Минск: 1987. – 30 с.

11. Хайкин,Б.Э. Беседы о дирижерском ремесле / статьи. Б. Э.Хайкин – М.: Сов. композитор, 1994. – 240 с.

*Нотная літаратура*

1. Дробыш, С.І. Дырыжыраванне: хрэстаматыя для народнага хору / С.І.Дробыш, С.Ф.Войцік, Л.І.Холупава. – Мінск.: Беларус. дзярж. ун-т культуры і мастацтваў, 2008. – 297 с.

2. Дробыш, С.І. “І песню родную люблю я…”: вучэб.-метадыч. дапам. / С.І.Дробыш, С.Ф.Войцік, Л.І.Холупава. – Мінск.: Промпечать, 2008. – 120 с.

3. Дробыш, С.І. Хрэстаматыя па дырыжыраванні народным хорам / С.І. Дробыш, С.Ф.Войцік, Л.М.Міхліна. – Мінск.: Беларусь, 1991. – 143 Несцяровіч, Г.Д. Ансамбль беларускай народнай песні: вучэб. дапам. / Г.Д.Несцяровіч, Л.І.Холупава, А.І.Дубавец. – Мінск.: Беларус. дзярж. ун-т культуры і мастацтваў, 2006. – 152 с.

## Метадычныя рэкамендацыі па арганізацыі самастойнай работы студэнтаў ( сольныя спевы)

Навучанне ў класе сольных спеваў носіць практычны характар. Веданне работы галасавога апарата, якасці вакальнага гучання, спосабах іх дасягнення, законах музычна – вакальнага выканальніцтва студэнт атрымоўвае ў працэсе спеваў і авалоданні вакальнымі навыкамі.

Выхаванне навыкаў і асабліва рухальнага, якім з яўляецца пеўчы навык, патрабуе частых сістэматычных практыкаванняў у фазе яго фарміравання і замацоўвання.

Частычнае перанясенне абавязковых тэхнічных практыкаванняў у самастойную работу студэнта робіць хутчэйшым тэмп і павышае ступень авалодання вакальнымі навыкамі, вызваляе час на занятках, дае магчымасць углубіць вакальную падрыхтоўку.

Пры навучанні сольным спевам трэба звяртаць увагу на:

- недастатковае разуменне ролі асобы ў выхаванні спевака ў вакальна-навучальным працэсе;
- адсутнасць у вакальнай літаратуры дастаткова поўных данных аб псіхолага-педагагічнай значнасці гэтага віда вучэбнай дзейнасці;.

Пры вакальным навучанні шмат часу трэба ўдзяляць выпраўленню прыродных ці набытых недахопаў голасавядзення. Паспяховае і хуткае іх выкараненне магчыма толькі пры пастаянным самакантролі, што забяспечвае самастойная работа. З гэтай мэтай у дамашнія заданні студэнта ўключаюцца неабходныя практыкаванні, якія дапамагаюць замацаваць і развіваць цяжка засваяльныя навыкі. Напрыклад, практыкаванні па выраўноўванню галосных, на выпрацоўку дакладнай дыкцыі, на згладжванне рэгістраў, на авалоданне правільнага пеўчага дыхання.

Назіранне за выкананнем самастойных заданняў, улік дасягненняў і недахопаў у дамашняй рабоце, дазваляюць выкладчыку зрабіць пэўныя вынікі і на іх падставе пры неабходнасці гібка змяняць методыку навучання, уносіць у яе карэктывы. Гэта стварае ўмовы для безперапыннага ўдасканальвання вучэбнага працэса, для павышэння яго эфектыўнасці.

Кожнаму вучэбнаму прадмету ўласцівы свае спецыфічныя асаблівасці ў самастойнай рабоце.

***Падрыхтоўчая***, якая стварае спрыяльныя ўмовы для засваення вакальных навыкаў на занятках. Да яе можна аднесці:

- развучване музычна-літаратурнага тэкста вакальнага твора:
- самастойнае распяванне;
- розныя практыкаванні, якія накіраваны на вызваленне ці ўмацаванне мышц галасавога апарата (артыкуляцыйных ці дыхальных органаў) у пачатку навучання.

***Трэніровачная,*** якая дапамагае засваенню, замацаванню і развіццю вакальных навыкаў. Гэта самы распаўсюджаны від самастойнай работы. Да яго адносяцца разнастайныя практыкаванні на вакальна-тэхнічныя і мастацкія задачы, вывучаныя на занятках, упетыя вакальныя творы дома.

***Кантрольная,*** вельмі важная для выяўлення вакальных навыкаў і ведаў. Форма – самастойная падрыхтоўка студэнтам вакальнага твора з метадычным разборам.

Асобна трэба разгледзіць самастойнае распяванне студэнта. У самастойнае распяванне павінны быць уключаны толькі тыя практыкаванні, якія цвёрда засвоены студэнтам і на якіх ён дасягнуў найлепшага гучання. Падбіраць з улікам выхавання ў студэнтаў асноўных вакальна-тэхнічных задач:

- арганізацыі дыхання і апоры гука;
- дакладнай дыкцыі;
- узнаўленню патрэбнай атакі гука;
- высокага па пазіцыі і роўнага гучання.

Эфектыўнасць самастойнай работы залежыць ад методыкі яе арганізацыі. Яна павінна быць працягам работы на занятках. Змест дамашніх заданняў неабходна будаваць так, каб студэнт пры іх выкананні абапіраўся на вакальныя навыкі і веды, якія набыў на занятках. Неад'емнай часткай эфектыўнасці самастойнай работы з'уляецца паступовасць ускладнення заняткаў (ад простага к складанаму, ад лёгкага к цяжкаму).

## Сродкі дыягностыкі

- вуснае (тэарэтычнае) апытанне па асноўных раздзелах і тэмах;
- практычныя паказы па тэхніцы дырыжыравання і вакалу;
- прадстаўленне прэзентацыі ці рэферата на зададзеную тэму;
- іспыт па дысцыпліне.